(1088(1998 г.)) і БДУ (за 1957-1981 і 1982-1994 гг) (1092(1998 г.)). Больш 50% доктарскіх і 40% кандыдацкіх дысертацый у абодвух выпусках паказальніка БДУ складаюць дысертацыі па сацыяльных і гуманітарных навуках, што характарызуе вядучую ВНУ Беларусі як адзін з буйнейшых цэнтраў сацыягуманітарных даследаванняў. Спісы дысертацый, абароненых у Нацыянальным інстытуце адукацыі друкаваліся ў часопісах псіхолага-педагагічнай тэматыкі (438, 736(1997 г.)). Усе гэтыя бібліяграфічныя крыніцы забяспечвалі крыніцазнаўчую базу вывучэння названых цэнтраў як суб'ектаў навукова-даследчай дзейнасці і падрыхтоўкі навуковых кадраў.

Асобныя віды, групы дакументаў сацыягуманітарнай тэматыкі раскрываліся ў бібліяграфічных выданнях і з улікам патрэбнасцей іншых сфер сацыяльнай дзейнасці і сацыягуманітарных навук. Звернем увагу гісторыкаў кнігі, спецыялістаў у галіне кнігавыдавецкай справы і журналістыкі на каталог выставы "Рукапісныя і друкаваныя кнігі беларускіх татараў" (103(1998 г.)), спісы перыядычных выданняў, якія выходзілі пад кантролем нямецкіх улад у 1941-1945 гг. у кнізе "Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны " (66(1996 г.)), каталог пазацэнзурнага перыядычнага друку Беларусі 1971-1990 гг.*, падрыхтаваны ў рамках праекту "Антыкамуністычная апазіцыя ў Беларусі 1945-1991" і выдадзены ў рамках праекту "Падтрымка незалежнай выдавецкай дзейнасці ў Беларусі ".

Рабіліся спробы падрыхтоўкі паказальнікаў зместу асобных перыядычных выданняў – "Нацыянальнай эканамічнай газеты"(358(1998 г.)), часопіса "Роднае слова" (2667(1997 г.)), матэрыялы якіх будуць карыснымі і спецыялістам адпаведных галін. Даследчыкам беларускай лексікаграфіі настольнаю кнігаю стане паказальнік "Тэрміналагічныя слоўнікі ", выдадзены Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф.Скарыны (3115(2000 г.)). На патрэбнасці педагогаў былі разлічаны спісы вучэбна-метадычных выданняў (2642(1998 г.));" Метадычная. літаратура – настаўніку-прадмет-ніку"(870(1999 г.)).

Напрыканцы адзначым, што на фоне пэўных станоўчых тэндэнцый фарміравання сістэмы бібліяграфічных выданняў сацыягуманітарнай тэматыкі ў Рэспубліцы Беларусь, выклікае заклапочанасць неадпаведнасць дзеючым стандартам вялікай колькасці выданняў, асабліва падрыхтаваных непрафесійнымі бібліёграфамі.

Прыемна, што ў разглядаемы перыяд значна актывізавалася выкарыстанне аўтаматызаваных тэхналогій пры падрыхтоўцы бібліяграфічных выданняў сацыягуманітарнай тэматыкі. Звязана гэта было не толькі з ажыццяўленнем камп'ютэрнага набору і вёрсткі, але і выкарыстаннем створаных у бібліятэках бібліяграфічных баз даных. Звесткі аб выкарыстанні спецыяльнага праграмнага забеспячэння пры падрыхтоўцы бібліяграфічных выданняў былі адзінкавымі.

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па прыродазнаўчых навуках

Р.А. Ровіна, В.А. Касап '2000.

Улічваючы сучасныя тэндэнцыі, характэрныя для вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі, невялікая колькасць бібліяграфічных дапаможнікаў, складзеных па традыцыйнай тэхналогіі за апошнія пяць гадоў па ўсіх галінах прыродазнаўчых навук, можа разглядацца як звычайная з'ява. Тым не менш весці размову аб нармальным забеспячэнні спажыўцоў інфармацыі, на наш погляд, немагчыма. З пункту гледжання колькасных паказчыкаў можна весці размову аб тэндэнцыі паступовага змяншэння публікуемых дапаможнікаў. Зарэгістраваныя ў «Летапісу друку Беларусі»(4(1996-2000 гг.)) бібліяграфічныя паказальнікі не ўяўляюць сабой сістэму, якая ўключае ўсе віды бібліяграфічнай прадукцыі па розных прыкметах, па розных галінах.

Каб пацвердзіць нашу думку, прааналізуем выяўленыя дапаможнікі па розных прыкметах.

Па-першае, абсалютная большасць паказальнікаў з'яўляецца навукова-дапаможнымі, на іх долю прыпадае амаль 95% ад агульнай колькасці дапаможнікаў прыродазнаўчай тэматыкі. На долю рэкамендацыйных паказальнікаў прыпадае астатнія 5%. Такім чынам, можна канстатаваць, што гэты від бібліяграфічнай прадукцыі на сучасным этапе развіцця ў рэспубліцы не атрымаў.

Па-другое, практычна немагчыма весці размову аб забеспячэнні спецыялістаў той ці іншай галіны прыродазнаўства сістэмай бібліяграфічных дапаможнікаў.

Якім жа чынам размяркоўваюцца навукова-дапаможныя паказальнікі з пункту гледжання галіны, тэматыкі і іншых прыкмет. Складальнікі бібліяграфічнай прадукцыі засяродзілі сваю ўвагу на падрыхтоўцы пераважна 2-х відаў паказальнікаў – тэматычных (комплексных) і персанальных (біябібліяграфічных). Да першага віда неабходна аднесці два выпускі паказальніка «Природа Беларуси» (607(1996 г.), 820(1997 г.)), у якіх адлюстравана ў комплексе літаратура па дадзенай праблеме адпаведна за 1992 год і за 1993-1996 гады. Кожны з паказальнікаў утрымлівае апісанне больш 2-х тысяч назваў кніг, артыкулаў з серыяльных выданняў, аўтарэфератаў дысертацый, матэрыялаў канферэнцый, апублікаваных у Беларусі і за яе межамі.

Добрай якасці паказальнікаў спрыяе грунтоўна распрацаваны даведачны апарат, які дазваляе ажыццяўляць шматаспектны пошук матэрыялаў. Сярод дапаможных паказальнікаў – імянны, алфавітны кніг і артыкулаў, назваў раслін і жывёл і інш.

Дзяржаўны камітэт па гідраметэаралогіі падрыхтаваў чарговыя паўгадавыя выпускі (за 1995-1999 гг.) анатаванага бібліяграфічнага паказальніка па гідралогіі і аграметэаралогіі (1121(1996 г.)), створанага ў 1994 годзе ў выніку аб'яднання «Аннотированного библиографического указателя литературы по агрометеорологии и сельскому хозяйству» і «Аннотированного библиографического указателя литературы по

* Пазацэнзурны перыядычны друк Беларусі (1971-1990): Каталёг /Уклад. Ю.Лаўрык, Л.Андросік. - Мн.:БГАКЦ, 1998. – 172 с. – (Архіў найноўшае гісторыі).

гидрологии». Паўгадавыя паказальнікі адлюстроўваюць розныя віды дакументаў – кнігі, матэрыялы канферэнцый, артыкулы ў сістэматычным парадку. Паказальнікі невялікія па аб'ёму, як правіла, кожны выпуск уключае ад 40 да 100 назваў дакументаў. Даведачны аппарат, на жаль, адсутнічае.

Найбольшую колькасць падрыхтаваных бібліяграфічных дапаможнікаў складаюць персанальныя (біябібліяграфічныя). Сярод гэтага віда прадукцыі прадстаўлены самастойна выдадзеныя паказальнікі, падрыхтаваныя навукова-даследчымі ўстановамі, і спісы навуковых работ вядомых дзеячоў беларускай навукі, апублікаваныя ў перыядычных выданнях. Грунтоўныя паказальнікі выдадзены ў серыі «Бібліяграфія вучоных Беларусі», напрыклад, інстытут фізіялогіі падрыхтаваў дапаможнікі, прысвечаныя В.М. Гурыну (1819(1999 г.)), М.І. Арынчыну (1804(1999 г.)), інстытут фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў – Б.Б. Бойка, М.М. Сіраце (1396(1999 г.), 1398(1999 г.)).

На нашу думку такая сітуацыя, калі агульная колькасць традыцыйнай бібліяграфічнай прадукцыі ў рэспубліцы змяньшаецца, нельга лічыць нармальным нязменна вялікую ўдзельную вагу персанальных паказальнікаў.

У друку ў свой час востра дыскусіравалася пытанне аб важнасці, неабходнасці падрыхтоўкі гэтага віда дапаможнікаў. Былі выказаны розныя погляды на бібліяграфічную прадукцыю гэтага кшталту. Сярод іншых, на наш погляд найбольш рацыянальнай, была думка аб неабходнасці публікацыі гэтай прадукцыі пераважна ў выглядзе ўнутрыкніжных ці ўнутрычасопісных паказальнікаў. Аналіз выкананых у рэспубліцы дапаможнікаў сведчыць аб тым, што абсалютная большасць іх надрукавана ў навуковых часопісах. Першае месца займае часопіс «Дифференциальные уравнения», на старонках якога надрукаваны спісы навуковых прац Э.І. Грудо (1270(1998 г.)), Н.В. Азбелева (839(1997 г.)), Ю.А. Мітрапольскага (866(1997 г.)) і інш.

## Библиографические пособия по медицине

В.А. Касап, Р.А. Ровина

Библиографическая продукция по медицине, как и в предыдущие годы, разнообразна по видо-типологическим параметрам, жанрам и значительна по количеству. За 1996-2000 гг. в республике было подготовлено более 60 библиографических пособий по многим темам здравоохранения и медицины.

В их создании принимали участие как библиотеки: РНМБ, библиотеки Минского и Гродненского медицинских институтов, НББ, областные библиотеки и др., так и центры медицинской информации: БелЦМТ, БелЦНМИ, научно-исследовательские институты и другие организации, отдельные лица. Большая часть составленных указателей создана в головной отраслевой библиотеке – Республиканской научной медицинской библиотеке.

Несмотря на значительное в целом количество выпущенной библиографической продукции, в конце 90-х годов она сократилась.

Исходя из видо-типологического насыщения потока созданных указателей, можно говорить о разветвленной системе продукции по медицине, в которой имеются все необходимые звенья: текущие пособия, ретроспективные и рекомендательные. Компонентами ее будут типы созданных указателей: тематические, биобиблиографические, отраслевые, указатели трудов сотрудников учреждений, персональные, региональные и т.д. Представлены в потоке и все жанры библиографических пособий: указатели, списки, обзоры. Значительно представлены и справки, отнесение которых к библиографической продукции является проблематичным.

Текущие библиографические пособия по медицине представлены общеотраслевыми указателями «Новые медицинские книги» (1280(1996 г.), 1598(1997 г.), 1806(1999 г.), 1918(2000 г.)) и «Новые книги»(1279(1996 г.), 1597(1997 г.), 1873(1998 г.), 1805(2000 г.)). Материал в них охватывает все разделы медицины, указаны шифры хранения документов. Несколько общеотраслевых текущих информационных сборников подготовлено Белорусским центром медицинских технологий, информатики, управления и экономики здравоохранения (БелЦМТ). Это: «Международные обзоры по медицинским технологиям и лечебной практике», «Вопросы организации и информатизации здравоохранения в Республике Беларусь». Интересным в них является реферативный раздел, где приводятся рефераты обзорных и проблемных статей, книг, авторефератов, патентной документации на русском и иностранных языках. Весь материал располагается по рубрикам ГРНТИ и приводятся шифры хранения документов в РНМБ. Наличие такого большого самостоятельного раздела делает полезным информационные издания как организаторам здравоохранения, так и научным работникам, практическим врачам.

В журнале «Медицинские новости» реферативный раздел присутствует почти в каждом выпуске. В нем публикуются рефераты на книги, материалы конференций.

Среди текущих тематических бюллетеней выделяется составленный БелЦМТ «Медико-биологические аспекты аварии на ЧАЭС: аналитическо-информационный бюллетень». Здесь два библиографических раздела: реферативный, в котором реферируются новые книги, поступившие в библиотеку по этой теме, и «клинические аспекты воздействия радиации на человека».

Тема влияния радиации на здоровье человека является наиболее актуальной для библиотек республики при создании ретроспективных указателей. Так, только РНМБ составила за 1996-2000 гг. около 10 ретроспективных пособий по данной проблеме. Это например, «Генетика человека и радиация» (1820(1999 г.)), «Влияние радиации на эндокринную систему» (1441(1996 г.)) и др. Все указатели отражают литературу за несколько последних лет. Они имеют единые правила отбора документов и расположения материала. Максимально полно отражаются книги, статьи из журналов, материалы конференций, авторефераты диссертаций, отчеты. Во всех указателях проставляются шифры хранения документов в

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ